**“Слуцкае Евангелле: беларускі рукапіс XVI ст.” (2005–2008 гг.)**

Слуцкае Евангелле – унікальны помнік кніжна-пісьмовай культуры Беларусі XVI ст. – лічыцца ўласнаручным творам слуцкага князя Юрыя Алелькавіча. Сёння рукапіс знаходзіцца ва ўласнасці Беларускай праваслаўнай царквы і захоўваецца ў Мінскім епархіяльным упраўленні. Даследаванне рукапісу адбывалася ў рамках сумеснага навуковага праекта “Слуцкае Евангелле (XVI ст.) як помнік моўнай спадчыны беларускага народа” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выкананага па гранце Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. У 2008 г. пры фінансавай падтрымцы кампаніі “Брытыш-Амерыкан Табака Трэйдынг Кампані” выпушчана электроннае выданне на CD-ROM “Слуцкае Евангелле: беларускі рукапіс XVI ст.”, якое змяшчае алічбаваны і транслітэраваны тэкст Слуцкага Евангелля, кадыкалагічнае і лінгвістычнае апісанні, слоўнік, бібліяграфічны спіс. У 2009 г. на падставе праведзенага даследавання ў выдавецтве Беларускага экзархата было выпушчана факсімільнае ўзнаўленне Слуцкага Евангелля, прызнанае пераможцам Міжнароднага конкурсу “Мастацтва кнігі” (Масква, 2010).